# "Красачкі" ды "Чабатухі"

## У чым адметнасць палескай культуры

**Летняя паездка на Піншчыну — як смак халоднай празрыстай вады з гаючай крыніцы. Новыя ўражанні, новыя людзі, новыя краявіды — усяго гэтага тут удосталь.**

### "ЧАРОЎНАЯ ІГЛА" Ў ДЗЕЯННІ

Пералічаць цікавінкі сферы культуры Пінскага раёна — справа няўдзячная. Бо тут іх вельмі шмат — вочы разбягаюцца ад таго, пра што можна і трэба гаварыць. Напрыклад, пра Мерчыцы, дзе адкрыты Цэнтр традыцыйнай культуры і побыту "Спадчына Палесся". Гэта сапраўдны музей з адметнымі экспанатамі, сабранымі з усіх куткоў Піншчыны. Прадметы адлюстроўваюць побыт і народныя рамёствы палешукоў. Або пра Парахонскую ДШМ, дзе адразу два дзіцячыя калектывы носяць званне "Узорны" — гэта ансамбль народнай песні і музыкі "Красачкі" і духавы аркестр. Прычым "Красачкі" ўнікальныя не толькі тым, што маюць граматы і дыпломы Міністэрства культуры Беларусі, Брэсцкага аблвыканкама, але і выступленнямі на Піншчыне, Брэстчыне, за мяжой.

А ў вёсцы Пучыны развіваюць свае кірункі работы. ... пяць чалавек, — ткуць ручнікі, посцілкі, вышываюць і проста цікава бавяць час, — кажа Вольга Латышэвіч.

Працуе ў Пучынах і пачатковая школа, у якой, да слова, у 1970-я гады выкладала мая маці, Людміла Аўдзеева, пасля заканчэння Брэсцкага педінстытута. Адметна, што яе ў школе памятаюць дасюль. Напрыклад, былы дырэктар Мікалай Калеснікові́ч. Хоць вучняў цяпер не так багата, як у часы, калі тут настаўнічала маладая Людміла Аўдзеева, установа ўтрымліваецца ва ўзорным парадку. Пераканаўся ў гэтым асабіста, дзякуючы экскурсіі, зладжанай **дырэктарам Міхаілам Ляшкевічам**, які сам займаецца разьбой па дрэве і дасягнуў у гэтым рамястве высокага майстэрства.

### "МЕЛОДЫЯ" НАВІДАВОКУ

Так склалася, што дамы культуры цяпер функцыянуюць не ва ўсіх паселішчах Піншчыны. У Каўбах клуба няма ўжо даўно. Але паглядзець ...



Кіраўнік "Мелодыі" Міхаіл Барычэўскі з Калавуравіцкага сельскага клуба



Загадчыца Пучынскага сельскага клуба Вольга Латышэвіч дэманструе свае вышыўкі

тутэйшыя жыхары, літаратар не раз адпачываў. Дарэчы, у суседнім Лапаціне, у адным з пакояў бібліятэкі, сёння знаходзіцца зала-музей Аляксандра Блока з рознымі цікавымі экспанатамі, пераважна выданнямі яго твораў.

А вось у Калавуравічах клуб працуе спраўна. Адна з фішак установы — дарослая эстрадная група "Мелодыя".

— У гурце шэсць чалавек, — расказаў **кіраўнік аб'яднання Міхаіл Барычэўскі**. — Займаемся кожны чацвер і суботу, ездзім з выступленнямі па многіх маланаселеных пунктах. ... жывуць як у Калавуравічах, так і ў суседніх вёсках. У клубе можна пагуляць у більярд, паўдзельнічаць у гуртках. А платна тут праводзяць канцэртныя і танцавальныя мерапрыемствы, якія карыстаюцца нязменным попытам.

Дарэчы, 25 жніўня ў аддзеле культуры Пінскага райвыканкама прайшла сустрэча з маладымі спецыялістамі. Цяпер у Лышчы, Дамашыцах, Пінкавічах будуць працаваць ды ладзіць святы вёсак ужо новыя арганізатары, а ў Парахонску стане больш настаўнікаў ДШМ. Практычна ўсе маладыя спецыялісты закончылі Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў. Як бач-

Але я гадзінамі, на жаль, гэтую царкву не сузіраў, а паехаў у суседняе паселішча Сташаны, дзе ў Доме фальклору ўжо доўгі час існуе народны аўтэнтычны калектыў "Чабатухі". Бабулі са Сташанаў дзе толькі не пабывалі! Спелі на шматлікіх імпрэзах на Брэстчыне, прэзентавалі вясельны абрад палешукоў "Убіранне каравая" ў рамках VII Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый "Покліч Палесся — 2022", зрабілі фурор на маштабным фальклорным форуме "Дзяснянскі карагод" у Бранску... Карацей, "Чабатухі" — гэта няўрымслівасць, весялосць, смех і дабро цягам усяго выступлення, якое хочацца слухаць бясконца. Тое

мяжой.

А ў вёсцы Пучыны развіваюць свае кірункі работы. Напрыклад, як распавяла **загадчыца мясцовага сельскага клуба Вольга Латышэвіч**, тут ужо не першы год творыць аматарскае аб'яднанне "Чароўная ігла".

— Удзельніцы нашага згуртавання, — а гэта на сёння не ва усіх паселішчах Піншчыны. У Каўбах клуба няма ўжо даўно. Але паглядзець тут ёсць на што. Напрыклад, на маленькую каплічку, якую замаляваў у нататнік рускі паэт-сімваліст Аляксандр Блок, наведаўшы гэтыя мясціны падчас Першай сусветнай вайны, або вялікі дуб, пад якім, як сцвярджалі пазней



Царква Святой Жываначальнай Тройцы (1758 г.) у вёсцы Дабраслаўка Пінскага раёна

ны чацвер і суботу, ездзім з выступленнямі па многіх маланаселеных пунктах. Рэпертуар у нас даволі разнастайны: гэта і сучасная эстрада, і народныя песні.

Яшчэ культработнікі рэгулярна завітваюць на імпрэзы ў ваколіцах. Так, нядаўна супрацоўнікі Калавуравіцкага сельскага клуба зладзілі свята вёскі Гальцы. З дапамогай сучаснай апаратуры адмыслоўцы выступаюць і ў палях, дзе, скажам, для камбайнераў ладзіцца цікавая культурная праграма. Яшчэ артысты неаднойчы выязджалі да юбіляраў сталага веку, якія на ўсе маладыя спецыялісты закончылі Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў. Як бачна, знаходзіць для ўстаноў культуры новыя кадры у гэтым рэгіёне навучыліся вельмі добра.

## ШВЭДЫ ЦІ СКВАРКІ?

Яшчэ адна цікавінка Піншчыны — старадаўнія драўляныя цэрквы, пафарбаваныя пераважна ў блакітны колер. На адну такую, у вёсцы Дабраслаўка, пабудаваную ў 1758 годзе ў гонар Святой Жываначальнай Тройцы, можна глядзець гадзінамі: храм, нібы карабель, лунае ў сінечы палескага неба.



Марыя (злева) і Антаніна (справа) Кузьміч з вёскі Альшанка

васць, весялосць, смех і дабро цягам усяго выступлення, якое хочацца слухаць бясконца. Тое могуць пацвердзіць і жыхары вёскі Парэчча, дзе калектыў са Сташанаў нядаўна ўдзельнічаў у VII Абласным свяце-конкурсе гарманістаў і выканаўцаў прыпевак "Грай, гармонік! Звіні, прыпеўка!".

Дарэчы, менавіта ў Сташанах і ў Альшанцы я ўпершыню пачуў палескае "швэды". Аказалася, гэта скваркі, кавалкі сала, запечаныя на патэльні. Пазней такое слова я сустракаў падчас размоў з многімі бабулямі і дзядулямі вёсак Паросцы, Кудрычы, Мокрая Дубрава, Лышча, Пучыны ды іншых на Піншчыне. Мабыць, яно захавалася ў гаворках з часоў Паўночнай вайны (то-бок з пачатку XVIII ст.). Відаць, непрацяглае бытаванне на мясцовых землях шведскай арміі пад кіраўніцтвам Карла XII, якая даходзіла нават да Палесся, у прыватнасці да Пінска, запомнілася тут надоўга.

Так што культура і гісторыя жывуць на Палессі і ў самабытнай мове, і ва ўнікальнай спадчыне, і ў музеях, бібліятэках, школах мастацтваў, і, канечне, у людзях, якія насяляюць непаўторны край. І гэтаму можна толькі парадавацца, як радуешся смаку халоднай вады з гаючай крыніцы спякотным палескім летам...

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ**
Фота аўтара